Многа разоў мы тлумачылі нашым чытачом, што калі польскія нацыяналісты, выступаючы проці беларушчыны, гавораць ад імені польскага народу, дык гэта брахня. Польскі мужык–хлебароб, польскі парабак, дворны ці фабрычны рабочы мо бліжэй да нашага беларуса–селяніна, чым да „свайго“ пана...

Ня раз выказывалі мы, што па тэй жа дарозе йдуць і расейскія нацыяналісты. Дарма „Вил. Вестн.“ баламуціць людзей, даводзячы, быццам *уся* Расея глядзіць на беларусаў яго вачыма. Дарма ўсе гэтыя Кансультанты і Саланевічы стараюцца зьменшыць вагу слоў аб беларускім руху Максіма Горкага, катораму бот на назе завязаць яны недастойны[1]. Дарма стараюцца вялікага пісьменьніка спусьціць „на дно“[2]... І між расейскім грамадзянствам ёсьць, дзякуй Богу, людзі, каторыя ўсьцерагліся хваробы *нацыяналізму,* каторыя шануюць кожын народ і спагадаюць яму ў змаганьні за свабоду культурнай працы.

Гэта прывычка казаць усюды: „Мы — расейскі народ“ — гэтак крэпка ўелася людзям у галаву, што яны пачынаюць думаць, быццам запраўды яны — гэта народ, а народ — гэта яны. Прыкрываючыся іменем народу ў благім, яны йшчэ ахватней кажуць „мы“, калі ёсьць чым народу пахваліцца. Гэта значыць: „Мы пахалі!“

Гэтыя самыя паны, гэтыя Саланевічы і Кансультанты, Цяпловы і Васільевы, што ад пачатку вайны, прытуліўшы вушы, сядзелі ў сваіх норах, памыкаюцца гаварыць ад імені народу нават і тады, калі йдзе аб кроў і жыцьцё гэтага народу. Самі на вайну ня йдуць, а за народ кажуць: „Мы гатовы ваяваць да апошняй каплі крыві“. І калі мільёны сярмяжнікаў, апрануўшы салдацкія шынялі замест сьвітак, выяўляюць перад усім сьветам сваю моц у гэтай страшэннай вайне, Саланевічы і Кансультанты на ўвесь голас равуць: „Мы пабеждаем!“

Бедны цёмны народ! Хто толькі не адважыцца гаварыць за цябе і ад твайго імені?..

Саланевічы і ўся іх хаўрузія лічуць, што гэткім крыкам яны выяўляюць свой „патрыятызм“, лічуць, што той, хто ня кажа: „Мы пахалі“, „ёсьць сэпаратыст“, ды перапісывалі ў „Сев.–Зап. Ж.“, „Нов. Вр.“ і „Вил. Вестн.“ даносы на „Нашу Ніву“.

Бяда ў тым, што наша газэта ня піша „*мы* побеждаем“, а піша аб расейскай арміі, аб гэтых мільёнах шэрых шынялёў.

А каб жа хто спытаўся, што ўся саланевіцкая хаўрузія зрабіла дзеля таго, каб памагчы расейскай арміі?

А вось што: ад самага пачатку вайны яны ўсялякімі брахнямі стараюцца пасеяць між народамі ўзаемную нянавісьць, нацкаваць адзін народ на другі. Робячы крыўду другім нацыям і кажучы пры гэтым „мы“, яны хочуць збудзіць у пакрыўджаных злосьць ня толькі да іх, але і да ўсяго расейскага народу, злосьць, якой дагэтуль ніхто ня меў[3].

## Напамінаньне

Ідзе час, месяц праходзіць за месяцам, і канца–краю не відаць тэй вялікай хмары, што заслала ўсё неба, закрыла сонейка. Вайна разыгралася так, як ніхто не спадзяваўся: столькі ахвяр узяла яна, столькі крыві пралілося, як не было ад пачатку дзён...

Колькі яшчэ трэба будзе ахвяр людзьмі і грашмі — ніхто не згадае. Ведама адно толькі тое, што на паўдарозе яна не затрымаецца[1].

Вось, па ўсіх краёх, што захоплены вайной, ідзе цяпер вялікая работа: каб так наладзіць жыцьцё, каб народ як найменей цярпеў ад вайны, каб забясьпечыць яму кусок хлеба. Гэта — першая мэта ўсіх дзяржаў, як тых, што йдуць разам з Расеяй, так і ворагаў яе.

Да гэтай работы прыкладае рукі ўсё грамадзянства. Яно закладае ўсялякія таварыствы дзеля помачы пацярпеўшым ад вайны, дзеля падмогі сялянам у гаспадарцы, дзе не хапае рабочых рук. Земствы і гарадзкія думы рупяцца аб тым, каб акуратна падвазілі хлеб і ўсялякія харчы там, дзе іх не хапае. Але ў гэтай рабоце выяўляецца ўсё тое, што не дае наладзіць яе

як мае быць. Выяўляецца вялікая патрэба зрабіць тыя перамены ў нашым жыцьцю, каторыя былі патрэбны здаўна, а цяпер — у часе вайны — бязь іх жыць нельга.

Вось гэтымі днямі ў Петраградзе адбылося засяданьне прадстаўнікоў розных думскіх партый — разам з прадсядацелем Гасударственай Думы. Яны, акуратне разгледзеўшы цяперашняе палажэньне, [прыйшлі да высновы] што каб зрабіць сякі–такі лад, трэба чым хутчэй склікаць Думу ды каб тамака дэпутаты з розных зямель Расейскай дзяржавы выказалі, чаго жадае народ, якія яго патрэбы, у чым ёсьць недахватка.

Прадсядацель Думы Радзянка маніцца пераказаць усё гэта Гасудару і прасіць, каб Дума была склікана.

Вайна апошнім часам дужа адбілася на нашай старонцы. Няхай жа нашы дэпутаты, каторыя дагэтуль не падавалі ў Думе ніякага голасу аб нашых справах і патрэбах, няхай яны хаця б цяпер, у час нечуванай завірухі, зразумеюць, які цяжар ляжыць на іх[2]. Нездарма іх выбіралі: няхай жа яны паслужаць тым, хто паручыў ім клапоты аб сваей долі!